
ТРЫМАЙСЯ ПРАЎДЫ

№ 2 (105) 2014

аБАЖУР

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS



Узгадваючы Генадзя Бураўкіна і размовы з ім напярэдадні восені 2011-га…

Зварот ГА «БАЖ» да міжнародных журналісцкіх арганізацый

Расійска-ўкраінскі канфлікт, як ніколі дагэтуль, абвастрыў пытанне журналісцкага прызначэння і адказнасці. Журналісты гінуць і церпяць на многіх войнах: іх выкрадаюць, вярбуюць, забіваюць, — але не кожная вайна пагражае журналістыцы як прафесіі.

У расійска-ўкраінскім канфлікце мы сутыкаемся з абуральнымі фактамі фальсіфікавання рэчаіснасці і маніпулявання грамадскай свядомасцю. Некаторыя расійскія журналісты адкрыта прызнаюць, што ўказанні адносна скажэння фактаў прыходзяць ад іх кіраўніцтва з Масквы. Супраць удзелу ў прапагандысцкай агрэсіі выступілі і некаторыя журналісты ў самой Расіі, пра што сведчыць ініцыятыва стварэння там незалежнага прафесійнага саюза.

Розгалас ад гэтай інфармацыйнай вайны даўно перасягнуў межы канфлікту дзвюх краін. Яна непасрэдна ўплывае на свядомасць людзей у памежных краінах, у тым ліку і Беларусі. Таму мы лічым, што сітуацыя з асвятленнем падзеяў на ўсходзе Украіны вымагае тэрміновай ацэнкі міжнароднымі журналісцкімі арганізацыямі. Калі не зрабіць гэтага своечасова, наступствы размывання стандартаў журналістыкі адчуюць на сабе людзі ва ўсім свеце.

Мы заклікаем Міжнародную і Еўрапейскую федэрацыі журналістаў, Асацыяцыю еўрапейскіх журналістаў, Еўрапейскі вяшчальны саюз, іншыя прафесійныя арганізацыі неадкладна правесці маніторынг асвятлення расійска-ўкраінскага канфлікту, ацаніць выкананне прынцыпаў журналісцкай этыкі, паслядоўна дамагацца захавання стандартаў прафесіі, каб спыніць нахабнае выкарыстанне СМІ палітыкамі ў інфармацыйных войнах.

Прынята Праўленнем ГА «БАЖ»

24.06.2014

а БАЖУР
ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS

ТРЫМАЙСЯ ПРАЎДЫ!

Выдавец: ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»
Перыядычнасць: 1 раз у 3 месяцы
Выдаецца са снежня 2000 г.
№ 2 (105) 2014 г.

Галоўны рэдактар
Уладзімір Барысавіч Дзюба

Фота на вокладках —
Наталля Каварская (1-я вокладка)
Photo.bymedia.net
Архіў «А»
Генадзь Верацінскі (апошняя)

Выданне зарэгістравана
ў Міністэрстве інфармацыі
Рэспублікі Беларусь,
рэгістрацыйны № 833 ад 04.12.2009 г.

Падпісана да друку 20.06.2014 г.
Дата выхаду 30.06.2014 г.
Фармат 60х84/8.
Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк.
Наклад 600 асобнікаў.
Заказ №
Распаўсюджваецца бясплатна.

Адрас рэдакцыі:
220030, г. Мінск,
вул. Камсамольская, 7–32.
Тэл./факс: (017) 203-63-66,
(029) 126-70-98
E-mail: abajur@baj.by,
baj@baj.by
Сайт: www.baj.by

Друкарня ТАА «МЕДЫСОНТ»
ЛП № 02330/0552782 ад 01.10.2010 г.
Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Ціміразева, 9.
Тэл.: (017) 203-74-10, 203-53-41,
(029) 623-74-10
medisont@gmail.com
www.medisont.com

Як застацца журналістам на інфармацыйнай вайне?

Масква вядзе інфармацыйную вайну супраць Украіны — гэтая тэза стала для многіх аксіёмай. А чым адказваюць украінскія медыі? І ўвогуле — які адказ у такіх умовах найлепшы?



Аляксандр КЛАСКОЎСКІ,
www.mediakritika.by

Гэтыя пытанні цалкам актуальныя і для Беларусі, якая сёння таксама трапіла ў чорнае сілавое поле ахопленых імперскім імпэтам расійскіх СМІ.

Адказы на гэтыя пытанні я шукаў разам з украінскімі калегамі падчас вандроўкі ў Кіеў.

Змаганне пасля Майдана

Сам Майдан як з'ява фізічная сёння пакідае ўражанне бутафорыі. На гэтым пятачку адшумелай рэвалюцыі (які часовыя ўлады не чапаюць, хоць гэта і стварае перашкоды транспарту) цяпер дамінуе трэшавая стылістыка, разлічаная на турыстаў. Тут збіраюць ахвяраванні, прадаюць сувеніры ў выглядзе залатых батонаў, «візітовак Яраша».

Сур'ёзныя людзі адсюль даўно сышлі, кажа мне суразмоўца з ліку тутэйшых грамадзянскіх актывістаў. Але, дадае яна, Майдан як з'ява духоўная не знік, загартаваныя вулічным змаганнем грамадзяне, калі што, возьмуць на цугундар і новую ўладу.


Сёння ж змаганне ідзе на іншых франтах, і лініі падзелу зусім іншыя, чым гэта было мінулай зімой.

Расійская агрэсія памяняла і прыярытэты ўкраінскай журналістыкі.

«Калі быў Майдан, у Адэсе і Харкаве былі каналы, якія не проста выступалі супраць Майдана, гэта быў згустак нянавісці. Тыя каналы і сёння працуюць, але яны не працуюць супраць краіны», — тлумачыць мне Мустафа Наем. Гэты ўкраінскі журналіст афганскага паходжання, калумніст вэб-газеты «Українська правда» ды адзін з натхняльнікаў праекта анлайнавага тэлебачання «Громадське ТБ», нядаўна стаў лаўрэатам прэміі імя Герда Буцэрыуса «Свабодная прэса Усходняй Еўропы».

Асіметрычны адказ

Што да расійска-ўкраінскага канфлікту, то «мы не можам быць аб'ектыўнымі, бо гэта наша краіна», — кажа Мустафа. Мы праходзім па 13-м паверсе адміністрацыйнага будынка ў цэнтры Кіева, дзе «Українська правда» ды «Громадське ТБ» арандуюць памяшканні.



Зазіраем у невялікі пакой, і я не адразу разумею, што тут жывы эфір. Спахопліваюся, толькі калі хлопец, што забяспечвае трансляцыю, незадаволена касавурыцца пасля таго, як спрацаваў бліц майго фотаапарата. «Громадське ТБ» працуе ў спартанскіх умовах, кампактнай камандай энтузіястаў, эфектыўнасць якой у разы большая, чым у калег на вялікіх, традыцыйных, каналах, кажа Мустафа.

Касцяк каманды гэтага анлайнавага тэлебачання склаўся з людзей, што за часамі Януковіча сышлі з іншых медыяў праз заціск свабоды слова. «Мы хацелі прадаць аўдыторыі сваю рэпутацыю», — зазначае мой суразмоўца.

«Громадське ТБ» стала вяшчаць мінулай восенню, за тыдзень да пачатку пратэстаў у Кіеве. І раскруцілася менавіта на асвятленні жыўцом падзей на Майдане ды вакол яго. Сёння ў кадры — найперш тое, што робіцца на ўсходзе і поўдні Украіны.

Наем адзначае, што новыя рэаліі спарадзілі, у прыватнасці, спрэчкі наконт тэрміналогіі: «цітушкі», антымайданаўцы, сепаратысты і г. д. Як найболей дакладна, карэктна маркіраваць тыя ці іншыя групоўкі, плыні, сілы? Адным са спосабаў стала ўжыванне рэмарак кшталту «як іх называюць такія і такія».

Пры гэтым, падкрэслівае Наем, украінскія СМІ не адказваюць сіметрычна на маскоўскую прапаганду: «Расійскія СМІ хочуць паказаць пэўную карцінку, мы ж хочам спазнаць праўду».

«Пасіянарныя медыі не абавязкова маргінальныя»

Іншая рэч, што такі падыход, на думку майго суразмоўцы, зусім не выключае грамадзянскай пазіцыі, пасіянарнасці. І «УП», і «Громадське ТБ» — рэсурсы з выразнай лініяй, тут не саромеюцца экспрэсіі. Рэдакцыі не выпадкова месцяцца побач: у іх працуюць аднадумцы. У пэўным сэнсе гэтыя два СМІ — як злучаныя пасудзіны.

«На шчасце, пасіянарныя медыі ва Украіне, адрозна ад Расіі і Беларусі, не абавязкова маргінальныя», — зазначае Наем.

Ягоны сябра і суаўтар шэрагу журналісцкіх расследаванняў Сяргей Лешчанка, намеснік галоўнага рэдактара «УП», дадае, што за час Майдана наведванне інтэрнэт-выдання ўзнялося ўтрая, да мільёна ўнікальных наведнікаў за суткі. Але пасля прэзідэнцкіх выбараў 25 траўня паказчык можа ўпасці, прызнае Лешчанка.

Аднак хто б ні перамог на выбарах, ён не стане для журналістаў гэтых СМІ святарнай каровай. Не выводзяць яны з-пад крытыкі і цяперашні часовы ўрад.

«Новая ўлада была б рада, каб мы адключыліся на пару месяцаў», — усміхаецца Мустафа. З яго слоў, сёння ў «Громадське ТБ» ёсць выхад на першы нацыянальны канал, перспектыва стаць сапраўдным, вялікім грамадскім тэлебачаннем. Але ў кожным разе яны не збіраюцца ісці шляхам канфармізму.

Дарэчы, «вялікія» ўкраінскія тэлеканалы, на думку Наема, «таксама шмат чаму навучыліся за гэтыя месяцы». Узрасла ўвага да таго, што адбываецца па-за межамі краіны. Набыты досвед працы ва ўмовах ваенных дзеянняў.

Напачатку журналісты ішлі на Майдан без засцерагальнай амуніцыі — акуляраў, бронекамізэлек; без прыкрыцця («тут жа ўсе свае»); хтокольвек праз гэта застаўся без вачэй, калі пачалі свістаць гумовыя кулі, выбухаць гранаты. Сёння «ў гэтым плане ўсе выраслі», адзначае Мустафа.

І ўвогуле, сама праца ў гушчы падзей робіць кантэнт болей праўдзівым, «журналіст у полі ўсё ж стараецца даць аб’ектыўную карцінку».



Добры аўтар шануе рэпутацыю

Паводле Наема, «пасля Майдана стала прыемна глядзець адзін аднаму ў вочы і не хлусіць. Ні ў кога няма жадання пераступаць мяжу і займацца прапагандай з гэтага боку. У нас іншыя мэты — інфармаваць пра тое, што адбываецца на ўсходзе, а не ваяваць супраць Пуціна».

Але ёсць і іншы аспект праблемы. «Украіна аказалася абсалютна не гатовай да інфармацыйнай вайны. У нас адсутнічае дзяржаўная інфармацыйная палітыка», — жорстка заявіла Юлія Маставая, галоўны рэдактар выдання «Дзеркало тиждня» («Зеркало недели»).

Прыватныя ж СМІ, паводле яе слоў, вызначаюць сваю палітыку, як могуць. Свой тыднёвік рэдактарка прылічвае да якаснай прэсы. Падкрэслівае: «Мы не друкуем палітычную джынсу. Ніколі». Дадае: асаблівасць «Дзеркала тиждня» не толькі ва ўменні здабываць эксклюзіўную інфармацыю, але і «ва ўменні счытваць трэнды, прагназаваць».

Мастовая кажа: «“Дзеркало тиждня” — гэта газета аўтарскай журналістыкі. Нашы аўтары — гэта людзі, якія разумеюць адказнасць перад грамадствам і дзяржавай. Яны заўжды будуць на баку цалкам відавочных фактаў».

Рэдактарка пералічвае гэты набор відавочнасцяў з гледзішча выдання — ад расійскай анексіі Крыма да няздольнасці цяперашняй украінскай улады.

Беларусь на чарзе?

Трэба прызнаць: ва Украіне таксама ёсць рэсурсы, што выглядаюць зусім аднабаковымі, не цураюцца публікацыі неправераных звестак. І разам з тым у кантэксце сённяшняга супрацьстаяння між Масквой ды Кіевам пазіцыі медыяў дзвюх краін зусім не сіметрычныя.

Амаль што ўсе расійскія СМІ сталі інструментамі ці закладнікамі аўтарытарнай улады, якая зрабіла стаўку на агрэсію, раздзіманне імперскіх інстынктаў. Прынцыповая адрознасць украінскай сітуацыі ў тым, што, як зазначыў адзін з маіх суразмоўцаў, «у краіне ёсць якая-ніякая дэмакратыя, і таму ўлады ў прынцыпе не могуць арганізаваць інфармацыйную вайну».

Калі існуе масіў адносна незалежных СМІ, то медыйная супольнасць не ходзіць шыхтом, не шчоўкае абцасамі. Многія выданні ва Украіне за лепшы адказ на інфармацыйную агрэсію ўважаюць прафесіяналізм, якасную журналістыку. Пры тым што журналісты, безумоўна, пачуваюцца патрыётамі Украіны.

У беларускіх жа рэгіёнах (Гомель, Брэст) тым часам украінскія каналы адключаюць. А вось расійскае вяшчанне ўлады чапаць баяцца. Мазгі беларусаў апынуліся пад тэрмаядзерным уздзеяннем шавіністычнай маскоўскай прапаганды.

Вярхоўка беларускай улады, пэўна, адчувае небяспеку інфармацыйнай агрэсіі з расійскага боку, але пакуль што, паводле экспертаў, не надае ёй такога значэння, каб рабіць нейкія радыкальныя захады. Заўтра ж, аднак, можа быць позна.

Ды і захады ўлада ўмее рабіць збольшага забаронныя. Ну ці арганізаваць прапагандысцкае мачылава ў адказ. Але гэта не рашэнне. Трэба развіваць уласную медыйную прастору. Бо сапраўдным адказам на брудную, чорную плынь хлусні ды шалу мусіць быць якасная, сумленная журналістыка.

Фота аўтара

Зміцер ГАЛКО,
«Новы Час»

Крымскі палон:

прастрэленыя ногі, адрэзанае вуха, катаванні токам і гімнам РФ

З самага пачатку мне не падабаўся ўведзены ва ўжытак з нечай «лёгкай рукі» выраз «ветлівыя людзі» ў дачыненні да захопнікаў Крыма.

На мой погляд, ён мог быць часткай інфармацыйнай вайны, якая працавала на агучанае Пуціным сцверджанне, нібыта не бывае інтэрвенцый без адзінага стрэлу, а значыць, у Крыме была не інтэрвенцыя. Нешта кшталту аперацыі па навядзенні парадку.



Знаёмаму з гісторыяй чалавеку вядома, што такія інтэрвенцыі ўжо былі, менавіта гэтак Гітлер захапіў Судэты. Але я не пра гістарычныя аналогіі, я пра хлуслівасць «ветлівага» вобраза акупанта. Мне хапіла адной сустрэчы ў херсонскім шпіталі з хлопцамі, якія амаль два тыдні знаходзіліся ў крымскім палоне, каб гэты вобраз рассыпаўся ў прах.

Маіх суразмоўцаў завуць Андрэй Шчакун і Юры Шаўчэнка. Аб'ядноўвае іх толькі пекла крымскага палону, праз якое яны прайшлі, бо да гэтага хлопцы былі незнаёмыя.

Андрэй — свядомы ўкраінец, родам з Львоўшчыны, філолаг па адукацыі, апошнія 23 гады жыў у Бахчысараі з жонкай і трыма дзецьмі. Жонка з мясцовых, дзеці нарадзіліся і выраслі ў Крыме. Узначальваў грамадскую арганізацыю «Украінскі дом», змагаўся за ўкраінскую школу, апошнімі месяцамі быў актывістам крымскага Еўрамайдана. Асоба вядомая і публічная. Напярэдадні святкавання 200-годдзя з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі ён прыйшоў на вакзал у Сімферопалі, каб забраць пяцьдзясят украінскіх сцягоў, якія перадалі для яго з мацерыковай Украіны. Гэта скончылася для яго амаль двухтыднёвым палонам.

Юрый — зусім малады хлопец з Паўлаграда, што на Днепрапятроўшчыне, без асаблівай цікаўнасці да палітыкі. Магчыма, менавіта гэтая акалічнасць ледзь не стала для яго фатальнай. Бо ён паверыў свайму крымскаму сябру, што на паўвостраве «ўсё ціха, нармальна», і прыняў яго запрашэнне прыехаць у госці, узяўшы з сабой заплечнік «з рэчамі па сезоне». Яго таксама затрымалі на вакзале ў Сімферопалі, бо прынялі за «актывіста нейкай радыкальнай арганізацыі».

«Гэта былі вельмі агрэсіўна настроеныя людзі, — распавядае Юрый. — На маё пытанне, міліцыя яны ці хто, мне проста заламалі рукі за спіну, надзелі кайданкі, узялі за каўнер і кінулі ў легкавую машыну. На падлогу паміж пярэднім і заднім сядзеннямі. Крычалі, што "ты казёл, урод, прыехаў нам тут усю маліну псаваць". Потым чалавек, які сядзеў на пярэднім сядзенні, дастаў нож, прыгразіў, што зараз парэжуць

мяне тут на кавалкі. І адрэзаў у мяне кавалак вуха…»

Юрыя некуды прывезлі, выкінулі на вуліцы, дзе збілі на горкі яблык на асфальце, потым перадалі іншай групе. Калі першая падобная па апісанні да так званай «самаабароны Крыма», то другая была апранутая ў форму «Руская бярозка»: людзі ў масках, з рацыямі, узброеныя аўтаматамі. Хтосьці з іх сказаў: «Прастрэльце яму, на хрэн, ногі». І Юрыю сапраўды прастрэлілі абедзве нагі, гумавыя кулі даставалі ўжо ў Херсоне, больш чым праз тыдзень.



Журналісцкі батальён (першы справа Дзмітрый Галко) у г. Дзімітраў

Юрыя зацягнулі ў нейкае памяшканне, кінулі тварам на падлогу, дзе ён праляжаў у лужыне ўласнай крыві, пасля чаго распранулі да майткоў, прывязалі скотчам да крэсла так, што паварушыцца было зусім немагчыма. Хлопец запытаўся ў сваіх захопнікаў, дзе ён, што з ім…



Дзмітрый Галко на Херсоншчыне, развозіць па ўкраінскіх часцях гуманітарную дапамогу

«“А ты падумай, — адказвалі яны мне, — навошта ты ехаў, што ты планаваў, хіба не разумееш, куды ты трапіў?” У такім нахабным тоне ўсё…» — расказвае Юрый.

Адбывалася ўсё, па словах хлопца, як на вайне, без стварэння бачнасці захавання хоць нейкай законнасці. Гэта толькі ў побыце гаворыцца, што «вайна ўсё спіша», на самой справе злачынствы застаецца злачынствам нават ва ўмовах вайны. І за яго, хочацца верыць, вінаватыя аднойчы адкажуць.

Раз-пораз да Юрыя заходзіў чалавек з аўтаматам, моўчкі наводзіў на яго зброю і рабіў выгляд, што зараз стрэліць. Пасля таго як Юрый змог вызваліцца ад скотча, яго прыкавалі кайданкамі да батарэі.

«Допыты, допыты, допыты… Ну, мне не было чаго хаваць, я ўсё расказваў, але іх мая простая гісторыя не задавальняла. Яны хацелі расказаў пра баевікоў “Правага сектара”, дзе іхныя атрады хаваюцца ў гарах… Ды адкуль мне ведаць?!» — гаворыць хлопец.

Потым Юрыя прывезлі да астатніх закладнікаў. Тут яны ўсе знаходзіліся з завязанымі вачыма, некалькі дзён іх не выводзілі нават у прыбіральню, даводзілася хадзіць пад сябе…

Юрый дадае, што яму «яшчэ пашанцавала». Праз нанесеныя адразу моцныя раненні яго ўжо асабліва не чапалі, нават дазволілі спаць на матрацы — астатнія туліліся хто на падлозе, хто на крэслах. А вось з хлопца, які быў на Майдане ў Кіеве, здзекаваліся пастаянна. Апроч фізічных катаванняў і «трэніровак» («упаў-адціснуўся»), прымушалі спяваць расійскі і савецкі гімны, крычаць «Слава Расіі!» і да т. п. Увесь час прыходзілі новыя людзі, каб паздзекавацца з яго.

«Хоць я таго хлопца і не ведаў зусім, вы разумееце, душу рвалі гэтыя здзекі, яны ж пры нас усіх адбываліся… А як ён страшна крычаў! Мне падалося, што я навечна трапіў у пекла», — дрыготкім голасам згадвае Юрый.

Праз тыя ж самыя выпрабаванні прайшоў і Андрэй Шчакун разам са сваім паплечнікам, 64-гадовым Анатолем Кавальскім, выкладчыкам аграрнага ўніверсітэта ў Сімферопалі. Яны сапраўды знаходзіліся на вакзале з «палітычнай» мэтай, і спачатку іх затрымала міліцыя «для высвятлення». Дакладней, дружыннікі з чырвонымі павязкамі савецкага ўзору і георгіеўскімі стужкамі, якія адвялі іх у аддзяленне. І ўжо адтуль іх забралі асобы з невядомым статусам, адвезлі ў нейкі падвал на машыне Анатоля Кавальскага, якую, натуральна, прысвоілі. Мужчынаў збілі, скруцілі рукі, завязалі вочы і распранулі дагала…

Андрэя і Анатоля, апроч усяго, катавалі токам. Чаго дамагаліся? Усё таго ж — базы, паролі, імёны баевікоў «Правага сектара»…

Нейкае прадчуванне бяды прымусіла Андрэя за колькі дзён да акупацыі вывезці сям'ю на мацярык. Але ў Бахчысараі ў яго засталася трохпакаёвая кватэра. У Анатоля Кавальскага — дом у Сімферопалі. Яны не змогуць туды вярнуцца, пакуль на іх зямлі знаходзяцца «ветлівыя людзі», а калі быць дакладным — параноідальныя садысты.



Сяргей ПУЛЬША

На вайне...
па «сацыяльным заказе»



Фота Аляксандра Хаменкі, gordonua.com

Журналіст газеты «Новы час» Дзмітрый Галко, больш вядомы як блогер Будзімір, і не падазраваў, што, скіраваўшыся на ўсход Украіны, патрапіць у зону баявых дзеянняў. Калі ён туды выправіўся, вайны яшчэ не было. Але яна пачалася, і, замест запланаванага месяца, камандзіроўка зацягнулася на 90 дзён. Адметнасць гэтай паездкі ў тым, што на яе быў своеасаблівы «сацыяльны заказ»: самі чытачы, зацікаўленыя ў інфармацыі з «гарачай кропкі», дапамагалі Зміцеру матэрыяльна.

Камандзіроўка па «сацыяльным заказе»

— Дзмітрый, як увогуле з'явілася ідэя не толькі паглядзець на Данбас, але і прыцягнуць у якасці «спонсараў» чытачоў?

— Жаданне паехаць на ўсход Украіны ў мяне з'явілася праз недахоп інфармацыі. Адпачатку я сачыў за Майданам і ўсё гэта перажываў. Калі пачаліся падзеі на ўсходзе Украіны, былі ўсяго толькі кароткія навіны: маўляў, робіцца тое і тое. А чаму яно робіцца, што там насамрэч — незразумела. Мала было вялікіх артыкулаў пра настроі ў суседняй краіне, пра магчымы шлях развіцця падзеяў. Бо насамрэч пра ўсход Украіны існуе не менш стэрэатыпаў, чым пра захад.

Камандзіроўка «па заказе» — справа не такая ўжо і новая. Ёсць прыклад Аркадзя Бабчанкі з ягоным праектам «Журналістыка без пасярэднікаў». Ён ужо даўно ездзіць па тых рэгіёнах, дзе адбываюцца сацыяльна значныя падзеі, на «спонсарскія грошы». Чытачы, зацікаўленыя ў праўдзівай, аб'ектыўнай і непадцэнзурнай інфармацыі, скідваюцца яму на камандзіроўку. Тут журналіст адказвае толькі перад чытачамі. Мяне гэты прыклад натхніў, і я паспрабаваў пашукаць такую падтрымку. Матэрыяльна мне дапамагалі чатыры-пяць чалавек, а асноўную частку грошай даў знаёмы праграміст.

Напрыканцы маёй працы ва Украіне пачалі прапаноўваць сродкі новыя людзі. Але я ўжо з'язджаў, і гэтыя грошы мне былі непатрэбныя.

— Калі ты туды ехаў, ты ўсведамляў, што едзеш у «гарачую кропку»?

— Па-першае, тады, калі я ехаў на ўсход Украіны, ніякай «гарачай кропкі» там не было. Канешне, ідэя гэтай «Наварасіі» там лунала ў паветры, але ніякіх баявых дзеянняў яшчэ не адбывалася. Баі ішлі ў Крыме, аднак я спачатку наведаў Харкаў і Данецк. І не было адчування, што можа здарыцца нешта такое, як адбываецца там зараз. Я ехаў ва ў нечым, магчыма, варожы, непрыемны, але не ў небяспечны рэгіён. Паездку планаваў так, каб апошнім рэгіёнам вандроўкі менавіта ў дзень рэферэндуму быў Крым. Але туды я ўжо не трапіў — і нават не спрабаваў пасля таго, як сустрэўся з крымскімі закладнікамі. Тым больш, за мной ужо цягнуўся нейкі «ўкраінскі след», асабліва пасля Данецка, дзе я жыў у адным пакоі з невядомым хлопцам. У ягоных рэчах знайшлі выбухоўку. Мяне потым дапытвала СБУ, нешта я ім пра таго хлопца казаў, паказанні даваў. Пра гэта пісалі, і пасля гэтага ехаць у Крым было небяспечна.

Канчаткова я гэта зразумеў пасля таго, як паразмаўляў з бежанцам з Крыма — хлопцам, якога два тыдні катавалі проста за тое, што ў яго быў украінскі сцяжок. Я да гэтага быў не гатовы.

Тое, што адбылося ў Данецку і Харкаве пасля, гэта цяжка было ўявіць… Параўнаць Данецк, калі я прыехаў туды ў першы раз, у другі, тым больш трэці, — гэта нібыта розныя гарады.

Так здарылася, што падзеі быццам ішлі за мною. Толькі выехаў з Харкава — на наступны ж дзень там адбылося крывавае пабоішча. Выехаў з Данецка — і там такая ж бойня. Потым быў адносна спакойны перыяд — Херсоншчына, дзе я затрымаўся тыдні на два, калі не больш. Мы ездзілі з дапамогай па вайсковых часцях украінскай арміі, на мяжы з Крымам.

Пакуль я ездзіў па Херсоншчыне, наведваў Адэсу і Кіеў, полымя грамадзянскай вайны ахапіла Данбас.

Журналістыка вайны

— Як там працуюць журналісты, мо з якімі калегамі давялося сустрэцца?

— Напачатку, у Данецку, ніякіх працоўных адметнасцяў не было. Там я ў асноўным «круціўся» на цэнтральнай плошчы, нават задаў колькі пытанняў мэру горада, калі ён выступаў з нагоды 200-годдзя з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі. Размаўляў там з актывістамі і Майдана, і Антымайдана. Тады яны і самі паміж сабою разумеліся — проста збіраліся на вуліцах у купкі і спрачаліся… А скончылася гэта, як у Луганску: заводзяць цябе за барыкаду, за калючы дрот, там нават вышка стаіць, як у ГУЛАГу, замацоўваюць за табой палявых камандзіраў, якія сочаць — ані кроку ўлева, ані кроку ўправа. І размаўляць, зразумела, можна было толькі з імі, а яны расказвалі толькі тое, што лічылі патрэбным. Са звычайнымі байцамі ў такіх варунках не паразмаўляеш…

А потым у Данецку, у ДНР, увогуле ўвялі акрэдытацыю, без якой нельга было працаваць. Зразумела, я яе не браў, бо цябе заносяць у нейкую базу дадзеных, кантралююць твае дзеянні, пра што ты будзеш пісаць. Зрабіў нешта не тое — і можаш адтуль і не вярнуцца.

Замежнікі — тыя не надта «парыліся» праз гэтую акрэдытацыю, асабліва тыя, хто піша, напрыклад, на італьянскай альбо французскай мове. Іх кантраляваць больш складана. Шмат хто «акрэдытаваўся ў ДНР» наступным чынам: чаплялі на сябе гэтыя «георгіеўскія стужачкі» і хадзілі з імі, як з пропускам. Я ж маскіраваўся пад перакладчыка пры замежніках.

Але нават акрэдытацыя ды стужачкі не заўсёды дапамагалі, бо нечакана маглі накінуцца на журналіста, збіць, разбіць тэхніку нізавошта: «Што здымаеш, чаму здымаеш, а ну-ка, выдалі, а ну-ка, пакажы…» Там проста кожны шараговы актывіст ДНР адчувае ўладу, бо за ім стаяць людзі са зброяй, і яны імкнуцца сваю «ўладу» прадэманстраваць. Я некалькі разоў назіраў такія «гопстопныя» дагляды, калі фотаздымкі знішчалі, відэатэхніку ўшчэнт разбівалі без усякіх прычын. Не спадабаўся — і ўсё.

Пра бяспеку

— Калі ты зразумеў, што трапіў у зону баявых дзеянняў, ты хоць нешта прачытаў пра паводзіны журналіста ў такіх сітуацыях? Дапаможнікі, інструкцыі, якія ёсць у інтэрнэце…

— Не, асабліва я такога нічога не чытаў — з інтэрнэтам там напруга. Але я сустракаў, зразумела, журналістаў буйных карпарацый і выданняў, мы з імі перасякаліся, размаўлялі… Канешне, напрыклад, BBC ці да іх падобныя значна больш экіпіраваныя. Яны могуць дазволіць сабе наняць машыну з кіроўцам, у іх цудоўныя шлемы, бронекамізэлькі. Яны мне распавядалі, што праходзілі адмысловую падрыхтоўку ці то ў Сербіі, ці то ў Косаве, у нейкім напаўвайсковым лагеры, кшталту «курсаў маладога байца» для журналістаў, якія мусяць працаваць у «гарачых кропках». Розніца паміж такімі журналістамі і мясцовымі, альбо фрылансерамі, канешне, каласальная.

Тым не менш… Часам здаралася, што «крутыя» журналісты з усёй іх тэхнікай і бронекамізэлькамі кідалі сваіх калег у даволі небяспечных сітуацыях. Напрыклад, калі мы былі ў Благадатным. Благадатны — гэта тое месца, дзе тэрарысты расстралялі блокпост украінскіх вайскоўцаў, шмат было загінулых. У прэсе гэты выпадак падавалі як расстрэл пад Валнавахай. Насамрэч Валнаваха ад таго месца даволі няблізка. На французаў, з якімі

я быў, накінулася група ўшчэнт п'яных людзей, спрабавалі іх камеру разбіць… А іншыя паглядзелі са свайго мікрааўтобуса, памахалі рукамі, маўляў, «мы бачым, у вас праблемы», і… з'ехалі.

— Пакуль ты быў там, у нас тут адбылася дыскусія. Частка прафесійных журналістаў заклікала астатніх не сунуцца ў «гарачыя кропкі» без падрыхтоўкі і лепш сядзець дома, чым быць там забітым… Што ты можаш сказаць на гэта?



Дзмітрый Галко на Херсоншчыне, развозіць па ўкраінскіх часцях гуманітарную дапамогу

— Часткова яны маюць рацыю, але насамрэч там вельмі шмат было і не падрыхтаваных журналістаў. Галоўнае, што я магу сказаць са свайго досведу, дык гэта тое, што не трэба, як кажуць, нарывацца. Італьянскі журналіст, якога забілі ў Славянску, і паранены там жа француз былі цалкам непадрыхтаваныя. Канешне, можна казаць, што яны былі без бронекамізэлек. Але навошта яны паехалі разам з сепаратыстамі здымаць, як тыя падрываюць нейкі мост? Гэта ўжо мяжуе з удзелам у тэрарыстычнай дзейнасці, і тут зусім неістотна — з бронекамізэлькай ты ці без яе.

Пасля таго як сепаратысты нас затрымалі ў Славянску, нас сфатаграфавалі, занеслі ў нейкі спіс, я даваў інтэрв'ю з гэтай нагоды — і вярнуцца ў Славянск я больш не спрабаваў. Хаця, канешне, цікава — там «самая гарачая кропка». Але для мяне, там ужо «засвечанага», ехаць туды было ўжо неапраўданай рызыкай.

У канцы паездкі мне, шчыра кажучы, адзін раз сарвало «клемку». Якраз у Данецку пачалася актыўная фаза антытэрарыстычнай аперацыі, і мы палезлі туды, дзе была перастрэлка. І я падумаў: «Ё-маё, а што я тут раблю? Я не стрымер, я не перадаю нічога ў жывы эфір, раптам мяне тут заб'юць, а дзеля чаго? Незразумела…»

Так што галоўная парада — гэта найперш думаць і разважаць пра ўзровень рызыкі. Часцяком яна бывае неапраўданай.

Хаця не аднойчы здаралася, што такія «звычайныя» журналісты ці фрылансеры апераджалі журналістаў з «наварочаных» медыякарпарацый. Бо яны маглі дазволіць сабе тое, чаго не маглі «карпарацыйныя» журналісты. Напрыклад, на месцы забойства ўкраінскіх вайскоўцаў у Благадатным мы апынуліся раней за ўсіх «крутых» з іх мікрабусамі і джыпамі. Бо частка «нашых» хлопцаў проста аб'ехала блокпост. Яны дамовіліся з нейкім мясцовым п'янчугам, які за 20 грыўнаў правёў іх праз поле ў абыход. Думаю, што журналісты CNN не сталі б такога рабіць.

Ці, скажам, сітуацыя з украінскімі вайскоўцамі, калі мы прабылі з імі больш за суткі і нават пераначавалі на тэрыторыі іх падраздзялення. Фармальна для таго, каб патрапіць у вайсковую часць, трэба ехаць у Кіеў, браць дазвол, у тым ліку на фатаграфаванне і г. д. А так мы пад'ехалі: «Слава Украіне!» — «Героям слава!» — «Як вы тут, хлопцы?» і гэтак далей, адно да аднаго, і мы правялі ноч у часці спецпрызначэння, сярод роты снайпераў, куды афіцыйна журналістам шлях закрыты.

Зараз аптымальны варыянт для працы на ўсходзе Украіны — гэта прыехаць туды, ну калі не турыстам, то блізка да гэтага. Пабыць там тыдзень-другі, а пісаць ужо потым, каб не ведалі — што ты, хто ты і пра што пішаш.

Мне падаецца, што, напрыклад, Ілля Азар, былы журналіст Lenta.ru, які вельмі доўга там знаходзіцца, пачынаў свае рэпартажы ў адной танальнасці, а зараз гэта проста расійская прапаганда… Проста ў яго іншага выйсця няма! Там ты — пад кантролем. Каб там заставацца, ты павінен пісаць тое, што падабаецца сепаратыстам, інакш цябе проста заб'юць, альбо давядзецца адтуль з'язджаць.

Вельмі добра там знаходзіцца групай, бо трэба шмат ездзіць, і не толькі па горадзе. Калі вас, напрыклад, шасцёра, лягчэй наняць машыну. І не толькі ў матэрыяльным плане. Вялікую групу не так лёгка затрымаць. Я думаю, што ў Славянску сепаратысты нас не ўзялі ў палон у немалой ступені яшчэ і таму, што гэта было, па-першае, сярод белага дня, а па-другое — мы былі ўтрох. Хаця што насамрэч спрацавала і чаму нас адпусцілі, дакладна невядома.

Сацсеткі — зло!

— А ты не баяўся, што можаш «засвяціцца» праз Фэйсбук альбо Жывы журнал? Тым больш што там у цябе фоткі былі і з нейкім снайперам, і на фоне бэтээраў?

— Так, усведамленне гэтага прыйшло ўжо потым, і сапраўды, шмат хто мне раіў разлочыцца з Фэйсбуку. Але там вельмі працяглая працэдура, а мне Фэйсбук быў патрэбны як сродак хуткай сувязі. Калегі потым падказалі, што, напрыклад, журналістка з Францыі проста змяніла сабе імя ў Фэйсбуку, і знайсці яе там было ўжо складана.

З сацыяльнымі сеткамі ў «гарачай кропцы» трэба быць вельмі абачлівым. Бо вамі могуць заняцца надта ўедлівыя людзі.

Спынілі нас аднойчы на блокпасту, і як мы яго праехалі, я дагэтуль не ведаю… Чапляліся да ўсяго. Паглядзелі, ці вісяць у таксіста георгіеўскія стужачкі, якое ён радыё слухае, мясцовае — добра. Хлопцы скемілі, пахавалі ўсе карткі з фотаапаратаў — хто ў майткі, хто ў шкарпэткі, бо ў іх там на здымках і батальён «Днепр», і параненыя ўкраінскі салдат у шпіталі, і самаабарона ў Дабраполлі, і шмат чаго яшчэ. Засталіся толькі пачатковыя здымкі з выбараў, калі скрыні былі яшчэ пустыя, іх прагледзелі і сказалі: «Добра асвятляеце, што ніхто не галасаваў».

Мяне там выратаваў хіба што беларускі пашпарт — паглядзелі на яго, сказалі: «Зямляк». Але пры гэтым мне давялося паказваць цуды акрабатыкі на пальцах, бо пашпарт аказаўся закручаным у жоўта-блакітную стужку, якую я на нейкай імпрэзе аўтаматычна сунуў у кішэню. Я спрабаваў дастаць пашпарт так, каб не было бачна гэтай стужкі… І добра яшчэ, што мой тэлефон быў разраджаны і яго не здолелі ўключыць, бо там былі фотаздымкі, афармленне, застаўкі — усё ўкраінскае… Калі б паглядзелі на кантакты і Фэйсбук — усё, кранты былі б… Для расстрэльнага «артыкула» па мерках сепаратыстаў хапіла б.

Так што трэба быць вельмі ўважлівым да таго, што і чым ты фатаграфуеш, карыстацца «воблачнымі» тэхналогіямі, не насіць з сабою ў кішэнях непатрэбную драбязу, а галоўнае — не ездзіць уначы праз блокпасты.

Каму на вайне жыць добра

— З расійскімі журналістамі даводзілася сустракацца, як яны працуюць?

— Што тычыцца Славянска і падобных мястэчкаў — для іх там «зялёнае святло», ледзь не чырвоную дарожку раскладаюць. Там яны ходзяць вальяжна, няспешна, з усёй апаратурай і ўсюды, ніхто да іх не чапляецца. Не ведаю, ці трэба была ім тая акрэдытацыя ў сепаратыстаў…

Уражанні ад іх працы, хутчэй, малапрыемныя. Нам у Адэсе ў шпіталі не ўдалося пагаварыць з тымі, хто гарэў у Доме прафсаюзаў. Нам казалі: «Вы разумееце, гэта рэанімацыя, усе ў цяжкім стане», — і гэтак далей. Мы, як кажуць, «увайшлі ў становішча». А расійская журналістка ўчыніла вэрхал, маўляў, ляцела сюды за тысячы кіламетраў… Узяла за горла гэтых медыкаў, з мацюкамі, «выбіла» для размовы аднаго хлопца. Але пытанне: навошта ёй было так нахабна ціснуць на ўрачоў і прыкладаць столькі намаганняў? Бо яна таго ж хлопца ўзяла за грудкі і пачала навязваць яму тое, што ён павінен ёй расказаць, а менавіта, што гэта «Правы сектар» там усіх забіваў. Яна проста змушала гэтага хлопца пацвердзіць яе думку. Вось такая «журналістыка»…

Яўген Фельдман з «Новай газеты» — я бачыў, як ён здымаў захоп Данецкай абласной адміністрацыі батальёнам «Усход». Ён таксама крычаў, што ён расійскі журналіст і каб яго не чапалі. Хаця ён, будзем так казаць, «не зусім правільны» расійскі журналіст, але тым не менш.

— А ўкраінскія журналісты?

— Украінскія журналісты там увогуле не працуюць. То бок працуюць альбо інкогніта, альбо, як і я, у якасці «перакладчыкаў» з замежнымі сябрамі. Бо там іх калі не заб'юць адразу, дык і тое добра. Асабліва яскрава гэта выявілася ў Марыупалі. Калі мы туды прыехалі, сепаратысты там стаялі яшчэ мітынгам. І казалі, тыцкаючы пальцамі ў наш бок: «Глядзіце, каб гэта былі не бандэраўцы (то бок журналісты-ўкраінцы) альбо немцы». Чаму немцы? Відаць, па іх разуменні, немцы — гэта значыць фашысты.



Журналіст Поль Гаго напісаў з нагоды гэтай фатаграфіі: «Нечаканы візіт Рамзана Кадырава, майго ўлюбёнага дыктатара, на Майдан Незалежнасці (Дзмітрый Галко)»

Могуць быць і правакацыі. Быў выпадак, калі адзін хлопец нібыта шчыра хацеў нам дапамагчы і звазіць на пост да казакаў. Але вельмі дзіўная ў яго была размова па тэлефоне з гэтымі казакамі: калі яны даведаліся, што мы не амерыканцы, то загадалі нас туды не везці. Што гэта азначае? Яны вельмі хацелі пабачыць амерыканцаў? Сумняваюся. Ці на блокпасту нас спынілі і першае, што спыталі, ці не з АБСЕ мы? Склалася ўражанне, што на АБСЕшнікаў там проста палююць...

Ці чакае Данбас на рускія танкі?

— Адзін з першых тваіх матэрыялаў з Данецка называўся «Данбас не чакае на рускія танкі». За два месяцы там узнік моцны сепаратысцкі рух — што адбылося?

— Я б не сказаў, што і зараз Данбас чакае на рускія танкі. Там не ўсё яшчэ перавярнулася з ног на галаву. Але пік гэтых настрояў, найвышэйшы градус істэрыі там узнік пасля Адэсы — расійская прапаганда падала трагедыю так, быццам бы «Правы сектар» жыўцом паліць людзей. Тады сепаратысцкія настроі заўважна ўзняліся, шмат

хто запісаўся ў апалчэнне. Але потым гэтая плынь сышла на нуль. Асабліва калі «байцы ДНР» перайшлі да масавага бандытызму: пачалі сярод вуліцы рабаваць мінакоў, забіраць мабільнікі, аўтамабілі. Праз гэта шмат хто расчараваўся ў Данецкай народнай рэспубліцы.

Глыбокіх каранёў, каб весці там грамадзянскую вайну, няма. Гэта ж не чачэнцы, не адасоблены народ. Мовы там сваёй няма, рэлігіі сваёй няма, гісторыі «крывавага супрацьстаяння» Украіне там няма. Усё гэта прынесенае праз тэлебачанне. Шмат хто можа паўтараць мантры расійскай прапаганды, але праз іх узяцца за зброю ахвотнікаў небагата. Таму і скардзяцца палявыя камандзіры, што да іх ніхто не ідзе, і не ідуць не таму, што баязліўцы, а таму што бачаць няшчырасць і несур'ёзнасць усяго гэтага.

Я б не сказаў, што настроі там змяніліся. Хутчэй, рэаліі ўсякіх ЛНРаў і ДНРаў шмат каго ад гэтай ідэі адштурхнулі.

Чыста тэхнічна «актыўны сепаратызм» там трымаецца сапраўды на расійскіх наймітах і зброі. Але абапіраецца ён, так бы мовіць, яшчэ і на «падушку абыякавасці». Так, яны там не чакаюць на рускія танкі, у іх няма «гарачай» рускай ідэнтычнасці, якая б не дазваляла ім жыць ва Украіне. Але ў іх няма і лаяльнасці да Украіны, няма атаясамлення з Украінай як з Бацькаўшчынай, як з роднай зямлёй.

Гэта мне шмат у чым нагадвае Беларусь. Данецк вельмі падобны да Мінска. Там таксама шырокія вуліцы, фантаны з падсветкай, скрыні для смецця, адносная чысціня на цэнтральных вуліцах. І такая ж адсутнасць у людзях якой-кольвек нацыянальнай ідэнтычнасці. І гэта дазваляе вельмі доўга ціснуць на іх звонку і маніпуляваць імі. Гэта не падтрымка тэрарыстаў, але самае для тэрарыстаў зручнае — духоўная кволасць людзей і адсутнасць супраціўлення тэрарыстам. Былі адзінкавыя выпадкі, але не масавыя, каб сабраўся шматтысячны мітынг, прыйшлі б да тэрарыстаў і сказалі: «Валіце адсюль нафіг, не стаўце нас пад пагрозу». Настроі такія ў людзей ужо ёсць, яны чакаюць, каб хутчэй гэта ўсё скончылася, але каб гэты фінал наблізіў нехта іншы, толькі не яны самі.

На Расію і Пуціна ўжо не спадзяюцца, а, хутчэй, на тое, што «справу» завершыць Кіеў, але каб нечым дапамагчы Кіеву — такога пакуль няма.

— Ты ва Украіне прабыў даволі доўга. На тваю думку, калі не будзе падтрымкі з боку Расіі, дзеянні сепаратыстаў згаснуць? Ці гэты рух надта моцны?

— Падтрымку сепаратыстаў, наколькі я зразумеў, Расія спыняць не збіраецца. Але, калі ўявіць, што раптам за тыдзень пераб'юць узброеных чалавечкаў, у горы ці лясы ніхто не пойдзе, бо іх там няма. Для грамадзянскай вайны, якая, скажам, была ў Чачні, там няма падставаў. Таму сапраўды многае залежыць ад таго, як будзе паводзіць сябе Расія.

Першае, што варта там зрабіць, — гэта адключыць расійскае тэлебачанне і пачаць ствараць працоўныя месцы.

Арганізм украінскай дзяржавы хворы, у Данбасе ён хворы асабліва. Хаця Данбас не выглядае надта дэпрэсіўным рэгіёнам. Тая ж Чарнігаўшчына выглядае больш дэпрэсіўнай. Таму што да хворай эканомікі там дадалася яшчэ і прапаганда, якая вядзецца з пачатку 2000-х гадоў. Партыя рэгіёнаў у гэтым рэчышчы добра папрацавала. Разабрацца з сепаратыстамі — не самае складанае, цяжэй змяніць навязаны людзям светапогляд, мадэль паводзінаў, расплюшчыць вочы на рэчаіснасць.

Напрыклад, я быў сведкам таго, як чалавек на поўным сур'ёзе абураўся, што Львоў называюць «сэрцам Украіны». На яго думку, гэта няслушна, і ў яго праз гэта «душа баліць»… Падаецца, што чуеш нейкае дурноцце, але гэтак адбываецца насамрэч. Ці яшчэ — таксіст, якога разам з намі спынілі на блокпасту, кажа нам: «Вы ж зразумейце, за што мы тут ваюем. Калі мы бандэраўцаў не спынім, яны ж пойдуць заваёўваць Еўропу!» Не Расію — Еўропу! Ці, што б ні здарылася, — ва ўсім вінаваты «Правы сектар». Калі прарасійскі батальён «Усход» выгнаў ДНРаўцаў з будынка Данецкай абласной рады, адзін вайсковец, які прадстаўляўся снайперам ДНР, паведаміў нам, што насамрэч батальён «Усход» — гэта таксама «Правы сектар». На поўным сур'ёзе! Гэта проста неадэкватнае ўспрыняцце рэчаіснасці, нейкае канспіралагічнае і міфалагічнае мысленне. Гэтага вельмі шмат, і ў гэтым палягае вялікая праблема. Бо такое кажуць не гопнікі з семкамі, а, здавалася б, разумныя людзі з вышэйшай адукацыяй.

Таму новай уладзе такое мысленне давядзецца мяняць. Набрацца цярпення, мудрасці і тлумачыць людзям, хто насамрэч і навошта развязаў гэтую грамадзянскую вайну, хто і з якімі амбіцыямі намерыўся разадраць іх зямлю на кавалкі. На гэта спатрэбіцца шмат часу. Пакуль загояцца раны ў знявечаных душах, пакуль выветрыцца з галоў прапагандысцкая хлусня і разам з ёй нянавісць да тых, хто размаўляе на роднай украінскай мове. Гэта чарговае выпрабаванне, якое давядзецца пераважыць. Божа, дапамажы і захавай Украіну.

«Визитка Яроша», *или* Пять пунктов ТВ-пропаганды

BBC




Страстные репортажи российского телеканала «LifeNews» о перестрелке на окраине Славянска, обнаруженных хрустящих долларовых банкнотах и визитках лидера «Правого сектора» Дмитро Яроша представляют собой классический, удобный для изучения набор приемов, при помощи которых прокремлевские СМИ формируют мнение сограждан об Украине.

Сообщения действующих в Славянске пророссийских сепаратистов и вслед за ними прокремлевского «LifeNews» о визитке Яроша, будто бы найденной в дотла сгоревшей машине, породили в сети целый вал пародий и издевательств.

1. «Правый сектор»

Тем не менее «визитка Яроша» — это важная для пропаганды деталь: она призвана подкрепить постоянные заявления Кремля и подконтрольной ему прессы о том, что движение «Правый сектор» виновно практически во всех беспорядках последнего времени в Украине. Эти обвинения сомнительны — по крайней мере, во многих случаях. Так, 7 апреля российское телевидение сообщило, что пророссийские демонстранты в Харькове «дали отпор» бойцам «Правого сектора», которые будто бы напали на них.

Молодой харьковский математик Сергей Мельник, однако, рассказал в Facebook, что дело обстояло иначе: они с единомышленниками были окружены и жестоко избиты пророссийскими хулиганами, когда уходили с концерта в Харькове в поддержку Майдана.



2. «Иностранное вмешательство»

Среди вещей, брошенных, как утверждается, нападавшими на Славянск боевиками «Правого сектора» и затем показанных «LifeNews», были новенькие на вид стодолларовые купюры. Кроме того, «LifeNews» дал в эфир комментарий самозваного мэра Славянска Вячеслава Пономарева, который заявил, что у нападавших было «оружие натовского образца». Это один из примеров того, как российское телевидение внушает, что США и Запад в целом каким-то образом стоят за событиями в Украине или даже непосредственно участвуют в них.

Не так давно государственное ТВ на основе сообщений о том, что директор ЦРУ Джон Бреннан побывал в Киеве, обвинило США в «развязывании гражданской войны на Украине».

Российское телевидение также говорит время от времени об участии сотрудников частных охранных фирм США, т. н. «частных армий», в конфликте, хотя никаких доказательств, кроме туманных собщений о людях в незнакомой форме или форме без опознавательных знаков, до сих пор предъявлено не было.

3. «Нацизм»

Когда самопровозглашенный мэр Славянска Вячеслав Пономарев показывал на камеру вещи, захваченные, по его утверждениям, после нападения на сепаратистский блокпост, он обратил особое внимание на немецкий пулемет времен Второй мировой. «Наши оппоненты продолжают вести свою фашистскую идеологию — и не только, поскольку используют оружие своих учителей», — сказал Пономарев «LifeNews».

Это лыко тоже вполне в строку: российское телевидение вслед за президентом Путиным и другими членами российского руководства старательно продвигает идею, что в результате Майдана к власти в Украине пришли «профашистские силы». В начале марта, например, на ТВ были сообщения, что в Западной Украине на двери домов и квартир русских клеили оскорбительные наклейки — аналогия со звездами Давида, которые нацисты рисовали на дверях евреев. Но никаких подтверждений, кроме снимка одной наклейки, предъявлено не было.

Демонстрантов с Майдана российское телевидение целенаправленно изображает последователями Степана Бандеры — лидера украинских националистов времен Второй мировой войны, сложная биография которого включала, как говорят историки, и период сотрудничества с нацистами. О пестром на деле (хоть и с перевесом в пользу западных областей) географическом, социальном и даже этническом составе киевского Майдана российское ТВ старается не упоминать.

4. «Святотатство»

Канал «LifeNews» изобразил нападение на блокпост у Славянска — то самое, в реальности которого пока еще сомневаются сторонние наблюдатели, — еще и как своего рода святотатство. Как подчеркнул репортер канала, нападавшие не просто нарушили Женевское соглашение 17 апреля и обещанное Киевом пасхальное перемирие.

«Именно в тот момент, когда в храмах шла пасхальная служба, они открыли огонь по мирным жителям, которые охраняли блокпост на въезде в город Славянск», — сообщил журналист.

Еще более высоким штилем изъяснялись в ток-шоу на государственном канале «Россия» 15 апреля: там зашла речь о том, что конфликт в Украине имеет в том числе и религиозный характер.

«Это полное беззаконие, это варварство, это откровенный фашизм. Это люди, которые ненавидят православие. С молоком матери, к сожалению, воспитали эту ненависть. Я не вижу никаких путей для внутреннего решения этого кризиса. На границе России сознательно создается русофобское государство с ненавистью к России и Русской православной церкви», — говорил участник ток-шоу, церковный деятель из Одессы.

5. Оправдание

После кадров с места стрельбы на окраине Славянска «LifeNews» показал обращение «мэра» Пономарева к Путину. Пономарев призвал российского президента ввести на восток Украины «миротворческие войска для защиты мирного населения от нападений Правого сектора национальной партии Украины».

«Они хотят нас сделать рабами. Они с нами не разговаривают, а просто убивают», — жаловался Пономарев.

В ходе аннексии Крыма российское телевидение тоже показывало кадры перестрелки: как утверждалось, тогда, 1 марта, боевики-националисты напали на здание правительства Крыма в Симферополе. Эти сообщения были в числе прочего использованы как повод для проведенного через Совет Федерации решения «дать президенту право» ввести войска в Украину.

Как утверждает, в частности, украинская НКО «Телекритика», кадры перестрелки были сфальсифицированы. Такие же сомнения есть и у украинских, и у сторонних наблюдателей относительно событий в Славянске.

Дьявольские козни в «Прямом эфире»

Ирина ПЕТРОВСКАЯ,
«Новая газета», Россия



Уникальные российские тележурналисты несут и несут свою правду.

Была когда-то на канале НТВ такая программа — «Профессия — репортер». Была, следовательно, и такая профессия. Были и репортеры — каждый со своей манерой, стилем, темой: Катерина Гордеева, Андрей Лошак, Павел Лобков, Вадим Такменев, Александр Зиненко, Илья Зимин. Иных уж нет, а те… кто где. А программа с тем же названием, как выяснилось недавно, все еще жива, курилка. Мало того, как сказано в пресс-релизе, вывешенном на сайте канала, каждый корреспондент, который ее делает, «уникален и преподносит свою уникальную точку зрения на ту или иную проблему, событие и явление».

Сцяпан на 1952 год скончыў Бярозаўскую сярэднюю школу, уступіў у камсамол і пачаў жыць асобна ад сям'і ў райцэнтры.

Судзілі хлопца разам з бацькамі і братам. 19-гадовага юнака адправілі ў канцлагер у Нарыльску. У ягоным прысудзе пазначаныя артыкулы 63-1 і 76 Крымінальнага кодэкса 1928 года.

Першы з іх азначае «здраду радзіме, г. зн. дзеянні, здзейсненыя… на шкоду ваеннай моцы СССР, яго дзяржаўнай незалежнасці ці недатыкальнасці яго тэрыторыі».

Артыкул 76 мае шырэйшую трактоўку. Ён прадугледжвае ўдзел у арганізацыі ці падрыхтоўцы любых «контррэвалюцыйных» дзеянняў — ад шпіянажу да дапамогі сусветнай буржуазіі.

Украінская нявеста

Сцяпан вярнуўся ў Беларусь самым першым. Ён пасяліўся ў Брэсце ды пачаў працаваць на «Брэстэнерга». Даслужыўся да кіраўнічых пасад.

Пастаялкі былі рэабілітаваныя 29 ліпеня 1992 года рашэннем прэзідыума Брэсцкага абласнога суда. Тады ўжо згінуў Савецкі Саюз, супраць якога яны і змагаліся ў маладосці.

Марыя расказвае гісторыю кахання Сцяпана з будучай міністаркай. Ягоны сябар вучыўся ў Кіеве. Сцяпан прыехаў да яго ў госці ды пазнаёміўся са студэнткай Кіеўскага медыцынскага інстытута Людмілай. Яна была простай вяскоўкай — нарадзілася на Палтаўшчыне.

Шлях у міністры

Атрымаўшы адукацыю, у 1964 годзе Людміла пераязджае ў Брэст і становіцца ўчастковым педыятрам у дзіцячай паліклініцы. Праз дзевяць гадоў яе перавялі ў абласную бальніцу. У гэтай установе яна працавала ажно да 2001 года, дайшоўшы да пасады галоўнага доктара.


Людміла Пастаялка трапіла ў высокую ўладу


Пасля Аляксандр Лукашэнка выклікае Людмілу ў Мінск — кіраваць міністэрствам. Разам з ёй пераязджае і муж, тады ўжо пенсіянер. Пасля смерці жонкі ён застаўся ў сталіцы — там і дзеці, і ўнукі. Але ў Батарэю штогод прыязджае. «Як здароўе дазваляе», — прызнаецца яго сястра.

Марыя дастае альбомы са здымкамі сваякоў. Па дзіўным супадзенні знаходзяцца фоты ўсіх, апроч Сцяпана. Яшчэ раз паглядзеўшы на здымкі бацькоў і расплакаўшыся, Марыя просіць не друкаваць іх — маўляў, не трэба варушыць нябожчыкаў. Страх і праз 60 гадоў не адпускае ахвяраў.

…Мы хацелі даць слова і самому Сцяпану Пастаялку. Аднак і ён вырашыў не ўзгадваць мінулае. На наш званок на мабільны тэлефон ён ветліва, але настойліва прамовіў: «Што було, то було», — ды паклаў слухаўку.

Батарэя — Мінск

Артыкул Мікалая Аляксандрава — адзін з найбольш удалых у мінулагодняй палітры нашых журналісцкіх прац. Так вызначыла журы конкурсу «Вольнае слова», які ўжо сем гадоў запар ладзіць Беларуская асацыяцыя журналістаў. Інфармацыйная нагода гэтага твора, на жаль, не састарэла. Але ці не больш істотнае для прафесійнага вока — аўтарскае майстэрства, уменне, вартае пераймання. Чытайце, зайздросцьце і — рабіце яшчэ лепш! Новы этап «Вольнага слова» чакае і вашых пераможных сюжэтаў.



Николай **АЛЕКСАНДРОВ**

КАЗНЬ В ЗАКОНЕ

Сугубо субъективные размышления

Приведение в исполнение смертного приговора в отношении Д. Коновалова и В. Ковалева, признанных судом виновными в терактах в минском метро 11 апреля 2011 года, а также в День Независимости 3 июля 2008 года в Минске и в Витебске в 2005 году, вызвало немалый резонанс не только в нашей стране. Это оказалось крайне болезненной темой во взаимоотношениях ЕС и Беларуси.

Кто что защищает?

Государственный телеканал «Беларусь 1» поспешил откликнуться на последние европейские шаги в свойственной ему манере: «Основной причиной, вызвавшей гнев евробюрократов, стал смертный приговор террористам Коновалову и Ковалеву. ЕС ввел визовые санкции против отдельных лиц и заморозил активы нескольких частных предприятий. Таким образом, цивилизованная Европа стала на защиту террористов и ввела санкции против белорусского народа».

Если вдуматься в этот краткий пассаж, то станет понятным, что в нем произведена элементарная подмена понятий. Выстроена ударная конструкция: с одной стороны — зловредные «евробюрократы», поставленные в одну шеренгу с пособниками террора; с другой — белорусский народ, страдающий от неких ужасных санкций, чреватых папертью.

Человеку, свободному от пропаганды и предубеждений, не нужно втолковывать, что данные решения, в том числе и о последних санкциях, принимаются не карикатурными «евробюрократами», а целыми странами через уполномоченных на то европейскими народами представителей руководящих структур по ту сторону Буга. И санкции эти вовсе не грозят обрушить баланс торговли и экономического взаимодействия между Беларусью и ЕС. Они направлены против ряда конкретных лиц и компаний, которые, по мнению европейцев, содействуют нынешнему режиму Беларуси, подвергающему репрессиям демократическую оппозицию.

Обратите внимание: в этом списке отстраненных от альпийских красот нет никого из судей или правоохранителей, причастных к процессу по делу Коновалова и Ковалева. И вовсе не воинственный гнев движет Европою, а другие чувства. Разве о защите террористов вели речь европейцы во весь этот предшествовавший расстрелу период? Никто ведь не оспаривал, что за

преступлением должно следовать наказание. Вопрос заключался лишь в том, следует ли в Беларуси XXI века отвечать кровью на кровь по ветхозаветному принципу.

Соглашусь с немецким политологом А. Раром: нынешняя конфронтация Беларуси и ЕС проистекает из разнополярных цивилизационных моделей и подходов. Политика здесь присутствует в гораздо меньшей степени, нежели мораль. Такова уж эта «разновекторная» специфика.

Наши симплициссимусы

Утром, идя на работу, спросил у давнего знакомца — охранника на автостоянке:

— Степа, ты за смертную казнь или против?

Тот сразу врубился в подоплеку вопроса:

— Я — за. А то народ разбалуется совсем. Другое дело, что много мутного вокруг этой истории. Может, надо было повременить с расстрелом, разобраться… Если эти двое подложили бомбу, то чего они хотели, что ими двигало-то? Я так и не понял. И один ведь отказался потом от показаний… А насчет отмены «вышки» — мы еще не дозрели, менталитет у нас не тот…

Ох, уж это спасительное для нашей хаты — «менталитет не тот»!

Вот на сайте «ИА REGNUM» высказывает свою позицию по этому же поводу Андрей Геращенко, белорусский писатель и общественный деятель (так обозначен на сайте его статус): «…Я уверен в том, что любое умышленное убийство должно караться смертной казнью — и только это является справедливым. Вы представьте: дорогой и близкий каждому из вас человек (ваш ребенок, родитель, любимый) окажется в могиле, а его убийца будет сидеть в тепле и коротать долгие вечера чтением книг, сидя на всем готовом! А мы с вами должны еще и содержать убийцу наших родных или близких, выплачивая на это налоги. Это нормально? Да, случаются судебные ошибки — мы помним невиновно расстрелянных по делу Михасевича (маньяк-убийца, действовавший в 70–80-х годах XX века на территории Беларуси. — «*ИА REGNUM*»). Да и других случаев предостаточно. Скажу больше — я не знаю и не уверен на 100 %, виновны ли именно Коновалов и Ковалев в этом преступлении, однако никаких причин не доверять следствию у меня нет».

Еще круче обостряет разговор блогер Александр Усовский: «Понимаю, что это невозможно, но как бы хотелось! Собрать в кучу всех родственников депутатов Европарламента — жен, детей, матерей, отцов, двоюродных племянников и троюродных внуков — и чтобы по всей этой многотысячной толпе какой-нибудь обкуренный марокканец от души пострелял бы из станкового пулемета. Причем в патронах его — не ограничивать. Ну а потом этого марокканца судить — самым гуманным европейским судом. Любопытно было бы послушать европарламентариев В ЭТОМ СЛУЧАЕ. Они по-прежнему будут нести всякую гиль и дичь о “неприкосновенности человеческой жизни”? О “гуманизме”? О невозможности отнять у человека жизнь? Или выстроятся в очередь под объявлением “требуется палач, оплата сдельная”?»

Убойные аргументы насчет возможной гибели родных или близких — они у сторонников смертной казни повторяются постоянно. Такое вот странное сочетание сентиментальности с брутальностью. И оно явственно перекликается с древней традицией «родовой кровной мести».

Уроки века

Общественные дискуссии вокруг смертной казни велись в Европе на протяжении и XIX, а более всего XX столетия. Сейчас даже удивительно узнавать, что в 1906 году Государственная дума России, куда входили депутаты от Брестского уезда, проголосовала за отмену смертной казни и приняла соответствующее постановление. Правда, правительство не приняло его, но каков прецедент! Лучшие умы — выдающиеся юристы, литераторы, публицисты, политики — выступали за отмену эшафота. С ними, кстати, были солидарны и народные низы, писавшие в газеты, например, такие письма: «Мы, крестьяне, пришли к заключению, что нам необходимо отменить смертную казнь. Убить человека можно, а воскресить его — не воскресишь никогда, никакими сказочными водами…»

Тогда же В. Д. Набоков, русский криминалист и общественный деятель, профессор права, утверждал: «Смертная казнь не может более признаваться мерой правосудия: она лишь остаток старого варварства, пятно на человечестве, “стыд и укоризну” ему наносящее».

Ему вторил православный публицист и философ С. Н. Булгаков: «Всякое убийство есть дело ненависти… Смертная казнь есть один из самых ужасных видов убийства, потому что она есть холодное, расчетливое, сознательное, принципиальное убийство, — убийство без всякого аффекта, без всякой страсти, без всякой цели; убийство ради убийства. И в этом ее главный грех и ужас… Вот этой-то внутренней победы над смертной казнью прежде всего я желаю и себе, и своим читателям».


Но понадобились еще десятилетия, вобравшие в себя и войны, и геноцид, и репрессии, пока планета не дозрела до «веерного отключения» казней. К настоящему времени в мире насчитывается 130 стран, отменивших смертную казнь в законе или на практике, и 68 стран, которые сохраняют

и продолжают применять эту меру наказания к различным видам преступлений.

США входят во вторую категорию стран, но и там применение этой меры наказания имеет свою специфику. Порою для сидельцев ожидание исполнения приговора оказывается весьма долгим. Был даже своеобразный рекорд, когда в штате Джорджия Джек Олдермен был приговорен к смерти за убийство своей жены 14 июня 1975 года в возрасте 24 лет, а казнен лишь 16 сентября 2008 года в возрасте 57 лет, более чем через 33 года.

В России не карают смертной казнью преступников с 1996, в Украине — с 1997 года.

В Европе лишь Беларусь сохранила в своем законодательстве эту исключительную меру наказания.



Страна в ловушке

В недавнем интервью телеканалу «Russia Today» Александр Лукашенко, отвечая на вопрос о Коновалове и Ковалеве, сказал: «Я уже говорил как-то публично, что для меня самое сложное — подписать соответствующий указ о непомиловании. Помиловал же я за весь период, по-моему, только одного человека».

Кого — не указано. Память не сохранила акт милосердия?..

Интервьюер Александр Гурнов, комментируя эту беседу с белорусским лидером, внес дополнительные штрихи: «Вчера он был предельно откровенен. Мы с ним практически половину интервью говорили о Боге. О том, как он считает, простит ли его Бог за то, что он регулярно посылает людей на смерть. Я был удивлен, когда он сказал: “Каждый раз подписывать отказ на прошение о помиловании, вы, Саша, не поверите, — это самое тяжелое в работе президента. А отменить смертную казнь мы не можем, потому что народ не поймет”.

Я его спросил, простит ли его Бог за это. Он сказал: “За этих простит. Я подписываю только по тем, по которым я убежден на 100 процентов, что они совершили те преступления, за которые нашим законом предусмотрена смертная казнь. Но не знаю, простит ли меня Бог за их матерей…”»

Господь в роли юридического эксперта («простит… по которым я убежден на 100 процентов») — это что-то новое…

И опять же спотыкание о «менталитет»: «народ не поймет…». Будто это какой-то языческий идол, требующий регулярных жертвоприношений…

Мне думается, белорусский президент сам для себя однажды создал эту «ловушку», инициировав в 1996 году референдум, где в числе прочих легко вписался вопрос о сохранении в республике смертной казни. Насколько я знаю, страны мира, отменявшие эту меру наказания в своем законодательстве, проводили данные решения через парламенты и правительства, но не через плебисциты. В чем разница? Народ, гражданское общество, элиты (политические, творческие, научные) — категории, разнящиеся и уровнем информированности, и правосознанием, и способами решения важнейших проблем. Народом при крепком ресурсе власти можно манипулировать, с элитами это не прокатит.

Есть и другая ловушка в нашей нынешней истории: президентский имидж, который, представляется мне, самим Александром Григорьевичем сформирован для своего правления. Миловать, по его разумению, означает показывать слабость перед миром. И казнь тут становится этаким непременным сценическим атрибутом.

Но милость (не обусловленная внешними обстоятельствами, а естественная) — как раз удел сильных. И страны, отменившие смертную казнь в своих законодательствах, проявили недюжинную волю, преодолевая архаику «менталитета».

Пра смяротнае пакаранне і пажыццёвае зняволенне



Крымінальны кодэкс Беларусі, які дзейнічае ў нашай краіне з 1999 года, прадугледжвае такую меру пакарання, як пажыццёвае зняволенне. Тым не менш і пасля ўвядзення ў дзеянне новага КК беларускія суды выкарыстоўваюць у якасці найвышэйшай меры пакарання смяротную кару. Хоць трэба прызнаць, што смяротныя выракі апошнім часам выносяцца не так часта, як гэта было да 1999 года. Тым не менш стрэлы ў сутарэннях Пішчалаўскага замка ўсё яшчэ гучаць.



Генадзь КЕСНЕР

Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (арт. 24), «смяротнае пакаранне да яго адмены можа выкарыстоўвацца ў адпаведнасці з законам як выключная мера пакарання за асабліва цяжкія злачынствы і толькі згодна з выракам суда».

За што могуць расстраляць

Сёння гэтая мера пакарання можа прызначацца за дванаццаць катэгорый злачынстваў у мірны час і за дзве — у час ваенны. Напрыклад, сярод гэтых катэгорый злачынстваў — «развязванне альбо вядзенне агрэсіўнае вайны» (ч. 2 арт. 122 КК РБ), «забойства прадстаўніка замежнай дзяржавы, міжнароднай арганізацыі з мэтаю правакацыі міжнародных ускладненняў альбо вайны» (ч. 2 арт. 124), «міжнародны тэрарызм» (арт. 126), «генацыд» (арт. 127), «злачынствы супраць бяспекі чалавецтва» (арт. 128).

Смяротнае пакаранне можа быць таксама прызначанае за «наўмыснае пазбаўленне жыцця пры абцяжарвальных абставінах» (ч. 2 арт. 139), «тэрарызм» (ч. 3 арт. 289), «тэрарыстычныя акты» (арт. 359), «здраду, спалучаную з забойствам» (ч. 2 арт. 356), «змову з мэтаю захопу дзяржаўнае ўлады» (ч. 3 арт. 357), «дыверсію» (ч. 2 арт. 360).



Да таго ж, расстраляць могуць за «забойства супрацоўніка міліцыі» (арт. 362), «выкарыстанне зброі масавага паражэння» (арт. 134), «забойства асобы падчас парушэння законаў і звычаяў войнаў» (ч. 3 арт. 135).

Выкананне смяротнага пакарання ў выглядзе расстрэлу адбываецца ў СІЗА № 1 МУС РБ у Мінску на вуліцы Валадарскага (Пішчалаўскі замак).

У адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь смяротнае пакаранне не можа выкарыстоўвацца да асоб, якія здзейснілі злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, да жанчын, а таксама мужчын, якім на момант вынясення прысуду споўнілася шэсцьдзясят пяць гадоў.

Магчымая альтэрнатыва расстрэлу

Трэба звярнуць увагу на акалічнасць, што ні ў водным са згаданых намі артыкулаў Крымінальнага кодэкса смяротная кара не прадугледжана як адзіна магчымае пакаранне.

Альтэрнатыва смяротнаму пакаранню ўпершыню была ўведзеная Законам Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 1997 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны і Папраўча-працоўны кодэксы Рэспублікі Беларусь». У адпаведнасці з гэтым актам у Крымінальны кодэкс упершыню была ўведзеная норма, якая прадугледжвала новы від крымінальнага пакарання ў выглядзе пажыццёвага зняволення.

Цяперашнім часам у Беларусі дзейнічае Крымінальны кодэкс, прыняты 9 ліпеня 1999 года (набыў сілу 1 студзеня 2001 года), якім смяротная кара прадугледжаная ў якасці выключнай меры пакарання (арт. 59) за некаторыя асабліва цяжкія злачынствы, спалучаныя з наўмысным пазбаўленнем жыцця чалавека пры абцяжарвальных абставінах. У адпаведнасці з тым жа артыкулам 59 КК РБ смяротнае пакаранне ў парадку памілавання можа быць замененае пажыццёвым зняволеннем.

Тым не менш, нягледзячы на ўзаконеную альтэрнатыву, паводле дадзеных Міністэрства юстыцыі Беларусі, з 1994 па 2011 год да смяротнага пакарання быў прысуджаны 241 чалавек. Прычым «расстрэльныя» выракі выносіліся і пасля пачатку дзеяння новага КК. Праўда, той жа Мінюст паведамляе, што ў 2012 годзе ніводзін чалавек у Беларусі не быў прысуджаны да смерці.

Пры гэтым улады чамусьці адмаўляюцца паведамляць, колькі чалавек за гэты час было памілавана. Адзін з параўнальна нядаўніх прыкладаў — зварот па гэтую інфармацыю ў Адміністрацыю прэзідэнта праваабаронцы з Брэста Рамана Кісляка. Ён паведаміў агенцтву БелаПАН, што яму адмовіліся даць інфармацыю пра колькасць памілаваных сярод асуджаных на смяротнае пакаранне, пачынаючы з 1994 года.

Паводле незалежных экспертаў, высветліць дакладную колькасць прысуджаных да смерці, расстраляных і памілаваных практычна немагчыма.

Пажыццёвае зняволенне

Такое пакаранне прадугледжана ў Крымінальным кодэксе як альтэрнатыва смяротнаму прысуду. Яно можа быць прызначана асобам, якія здзейснілі злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, жанчынам, а таксама мужчынам, якім на момант вынясення прысуду споўнілася шэсцьдзясят пяць гадоў.

Асуджаныя да пажыццёвага зняволення адбываюць пакаранне ў папраўчай калоніі асаблівага рэжыму альбо ў турме. Праз дваццаць гадоў у прысуд чалавека, які асуджаны на пажыццёвае зняволенне альбо якому смяротнае пакаранне ў парадку памілавання заменена пажыцёвым зняволеннем, могуць быць унесены карэктывы. Суд, улічваючы стан яго здароўя ці ўзрост, а таксама паводзіны, можа замяніць далейшае адбыванне пажыццёвага зняволення пазбаўленнем волі на пэўны тэрмін, але не больш за пяць гадоў.

Без працэдур

Як адзначаюць праваабаронцы, смяротныя прысуды часам прыводзяцца ў выкананне яшчэ да заканчэння ўсіх прадугледжаных заканадаўствам і міжнароднымі нормамі працэдур.

У 2009 годзе да смяротнага пакарання былі прысуджаныя Андрэй Жук (за ўзброены напад і забойства мужчыны і жанчыны) і Васіль Юзэпчук (за забойства шасці жанчын сталага веку). У кастрычніку 2009 года асуджаныя на смерць падалі скаргу ў камітэт ААН па правах чалавека. Камітэт заклікаў беларускі ўрад не выконваць смяротныя прысуды да разгляду скаргаў. Тым не менш абодвух мужчын расстралялі ў 2010 годзе — да разгляду іх скаргаў.

Вялікі розгалас як у Беларусі, так і па-за яе межамі мела справа пра выбух у Мінскім метрапалітэне,

які адбыўся 11 красавіка 2011 года. Вінаватымі ў здзяйсненні злачынства былі прызнаныя жыхары Віцебшчыны дваццаціпяцігадовыя Дзмітрый Канавалаў і Уладзіслаў Кавалёў, якіх Вышэйшы суд Беларусі прысудзіў да смяротнага пакарання. У вялікай колькасці назіральнікаў як вядзенне, так і вынікі следства, а потым і суд, выклікалі шэраг пытанняў. Тым больш што Уладзіслаў Кавалёў не прызнаў сваёй віны і на судзе заявіў, што падчас папярэдняга следства даваў паказанні пад ціскам.

Кавалёў і ягоны абаронца таксама накіравалі скаргу ў Камітэт ААН па правах чалавека. Як і ў выпадку з Жуком і Юзэпчуком, Камітэт ААН заклікаў кіраўніцтва Беларусі не прыводзіць прысуд у выкананне да разгляду скаргі. Тым не менш усяго праз некалькі месяцаў пасля вынясення смяротнага выраку (30 лістапада 2011 года) Канавалаў і Кавалёў былі расстраляныя (сярэдзіна сакавіка 2012 года). Пазней Камітэт ААН па правах чалавека прызнаў недахопы падчас следства і суда і прыйшоў да высновы, што беларуская дзяржава парушыла галоўнае права Уладзіслава Кавалёва — права на жыццё (Канавалаў, які падчас суда не вымавіў амаль ніводнага слова, у Камітэт ААН не звяртаўся).

Трэба адзначыць, што сваякам расстраляных не паведамляюць ні дакладны час прывядзення прысуду ў выкананне, ні месца пахавання, не кажучы ўжо пра выдачу цела расстралянага. Таму маці Уладзіслава Кавалёва Любоў Кавалёва пачала шырокую кампанію не толькі ў абарону добрага імя свайго сына, але за адмену смяротнага пакарання ў Беларусі ўвогуле. Жанчына таксама патрабуе выдаць ёй цела сына і ягоныя дзённікі, якія Уладзіслаў вёў, калі знаходзіўся за кратамі.

Расстрэлы можна адмяняць

11 сакавіка 2004 года Канстытуцыйны Суд (КС) Рэспублікі Беларусь вынес заключэнне № З-171/2004 па справе «Аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і міжнародным дамовам Рэспублікі Беларусь палажэнняў Крымінальнага кодэкса РБ, якія прадугледжваюць выкарыстанне ў якасці пакарання смяротную кару». У сваім рашэнні КС звярнуў увагу, што норма ч. 3 арт. 24 Канстытуцыі, якая дапускае пакаранне ў выглядзе смяротнае кары, адначасова ўтрымлівае і згадку пра яе выключны і ЧАСОВЫ характар.

У заключэнні КС адзначана, што адмова ад выкарыстання смяротнага пакарання на еўрапейскім кантыненце стала агульным правілам. Дзяржавы — чальцы Савета Еўропы, якія падпісалі і ратыфікавалі Еўрапейскую Канвенцыю пра абарону правоў чалавека і асноўных свабод 1950 года і Пратаколы да яе № 6 ад 28 красавіка 1983 года і № 13 ад 3 траўня 2002 года, абавязаныя выключыць смяротнае пакаранне.

У той жа час Канстытуцыйны Суд адзначае, што Рэспубліка Беларусь не з’яўляецца чальцом Савета Еўропы, у звязку з чым выкананне згаданых дакументаў для яе не абавязковае. Не ратыфікаваны і Другі факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які таксама абавязвае кожную дзяржаву — удзельніцу гэтага Пратакола — зрабіць усе неабходныя захады для адмены смяротнага пакарання ў межах сваёй юрысдыкцыі. Паколькі згаданыя вышэй міжнародныя дамовы не ратыфікаваныя, што абумовіла б паводле артыкулаў 8 і 116 Канстытуцыі Беларусі вяршэнства міжнародных актаў у сістэме нацыянальнага права, КС прыйшоў да высновы, што ў сучасных умовах пытанне пра адмену гэтага віда пакарання альбо пра ўвядзенне маратолыя на яго выкарыстанне можа быць вырашана прэзідэнтам РБ і парламентам.

Такім чынам, з дакумента КС вынікае, што ніякага рэферэндуму аб адмене смяротнага пакарання, пра што шматкроць казаў кіраўнік нашай дзяржавы, калі спасылаўся на вынікі плебісцыту 1996 года, не патрабуецца. Бо, яшчэ раз падкрэслім, смяротнае пакаранне ў Асноўным законе Беларусі прапісана як ЧАСОВАЯ мера.

Чаму нельга выкарыстоўваць смяротнае пакаранне

Як лічыць кіраўнік юрыдычнай камісіі Беларускага Хельсінкскага камітэта Гары Паганяйла, выкарыстоўваць расстрэл нельга не толькі таму, што ёсць міжнародныя стандарты, грамадская мараль. «Рэч у тым, што сёння суды ўсё ж недасканалыя, ёсць верагоднасць судовае памылкі, асабліва па крымінальных справах. У крымінальным працэсе высветліць “ісціну ў апошняй інстанцыі” практычна немагчыма. Можна наблізіцца да яе, але не вызначыць. У звязку з гэтым лічыцца немагчымым выкарыстанне смяротнага пакарання, таму што такая мера ёсць незваротнай. Ёсць дзясяткі прыкладаў, калі праз некалькі гадоў высвятляецца, што людзі, прысуджаныя да смяротнага пакарання, не здзяйснялі злачынства. Падобныя гісторыі меліся і ў сучаснай Беларусі», — адзначыў юрыст.

Дастаткова прыгадаць сумна вядомую «Віцебскую справу», калі яшчэ да таго, як злавілі сапраўднага маньяка — забойцу жанчын Генадзя Міхасевіча, — аднаго чалавека расстралялі, трох асудзілі на пятнаццаць гадоў зняволення і яшчэ некалькіх — да меншых тэрмінаў пазбаўлення волі.

Тым часам Беларусь застаецца адзінай краінай не толькі ў Еўропе, але нават на тэрыторыі ўсяго былога СССР, дзе дагэтуль выносяцца і прыводзяцца ў выкананне смяротныя прысуды. І адзінай дзяржавай на кантыненце, якая не з’яўляецца чальцом Савета Еўропы. Бо адмена смяротнага пакарання ці хаця б увядзенне мараторыя на расстрэлы ёсць адной з галоўных умоваў сяброўства ў СЕ.



Олег АГЕЕВ,
юрист,
правозащитник

Смогут ли сейчас журналисты без ограничений работать в судах?

Порядок доступа к «гласному» белорусскому правосудию, который сложился на практике, затрудняет освещение судебных процессов. Изменится ли что-то в связи с официально декларированным стремлением к гласности?

В начале января этого года на сайте Верховного Суда было опубликовано Постановление Пленума ВС «Об обеспечении гласности при осуществлении правосудия и доступа к информации о деятельности судов»[1], принятое 20 декабря 2013 года.

Ситуация для принятия этого документа «созрела» уже давно. Журналисты и правозащитники неоднократно заявляли, что тот порядок доступа к «гласному» белорусскому правосудию, который сложился на практике, в значительной мере затрудняет освещение судебных процессов. У желающих сделать общедоступной информацию о том или ином судебном заседании возникают проблемы, — начиная со входа в здания суда, в помещение, где рассматриваются дела. Их попросту могут не пустить на порог сакрального места, в котором вершит свои таинства белорусская Фемида. Если же этот порог все же преодолен, то попытки фиксировать ход процесса часто пресекаются лицами, которые должны быть напрямую заинтересованы в том, чтобы максимальное количество



[1] http://court.gov.by/jurisprudence/Post_plen/general/b508a0b355b551ef.html

людей узнало, насколько справедливы, беспристрастны и независимы наши суды. Но сами судьи, а также прокуроры, охранники, конвойные, секретари судебных заседаний делают все возможное, чтобы информация о происходящем в зале суда не ушла дальше стен зала заседаний.

Поэтому стремление к гласности, зафиксированное в Постановлении Пленума ВС, обнадежило и порадовало журналистов, правозащитников, адвокатов и иных заинтересованных в публичности правосудия лиц.

Но находятся среди них и пессимисты, которые утверждают, что принятое постановление не изменит ситуацию с гласностью судебных процессов. Их доводы вполне аргументированы и заслуживают внимания.

Отечественная судебная система, мягко говоря, далека от совершенства. Перечень системных проблем в белорусских судах занимает многие страницы в докладах международных органов и национальных правозащитных организаций. Периодически и сам Верховный Суд возьмет да и заметит, что не все в порядке в судебной ветви власти. Естественно, этот «сор» редко выносится из избы, поскольку многие проблемы уходят своими корнями так глубоко, что даже задумываться об их решении совсем небезопасно для собственного судейского кресла. А в ситуации, когда системные вопросы не могут быть разрешены, чиновникам безопаснее их скрыть. Сделать так, чтобы общество получало только картинку, которая не дает возможности стороннему наблюдателю, видевшему хотя бы по телевизору, как осуществляется правосудие в других странах, понять, что наши суды по многим критериям страшно далеки от международных стандартов, нацеленных на справедливое и публичное разбирательство дела компетентным, независимым и беспристрастным судом, созданным на основании закона.

Из-за этого наши судьи заинтересованы в том, чтобы система оставалась «закрытой» — ведь не только престиж мантии отдельного судьи, но и репутация целой ветви власти могут оказаться сильно подпорчены, если из-за стен судов выльется информация о том, что там действительно происходит.

Внимательное чтение упомянутого Постановления Пленума приводит к печальной мысли: Верховный Суд не привнес нового в правовое разрешение наболевшей проблемы. Действующее законодательство и ранее закрепляло порядок, который должен был позволять журналистам выполнять свои профессиональные обязанности в судах без всяких ограничений. Постановление лишь обратило внимание судов на то, что действующая правовая база «о гласности судебного разбирательства, обеспечение доступа к информации о деятельности судов способствуют законному, обоснованному и справедливому разрешению дел в судах».

Наш Верховный Суд не стал использовать пример Верховного Суда Российской Федерации, который в своем аналогичном Постановлении от 13 декабря 2012 года № 35 в п. 23 предусмотрел, что «несоблюдение требований о гласности судопроизводства в ходе судебного разбирательства свидетельствует о нарушении судом норм процессуального права и является основанием для отмены судебных постановлений». Российский судья, зная, что необоснованное удаление журналистов из зала суда может повлечь при определенных условиях отмену принятого им решения по делу, конечно же, не станет рисковать результатами своей работы и не будет нарушать права журналистов. Белорусский Верховный Суд даже не пугает наших судей аналогичными мерами воздействия за возможные нарушения публичности при рассмотрении дел.

Не предусмотрены в обсуждаемом Постановлении и меры воздействия на охранников, конвойных и других лиц (зачастую в «штатском»), которые могут стоять на пути к получению информации о деятельности судов. Такие лица не являются сотрудниками судебной системы и подчиняются совсем другим органам. Данная категория служащих в принципе не знает и знать не хочет ни международных актов, ни национального законодательства, взывающего к открытости судов. Эти люди охотно и с пристрастием выполняют инструкции своего начальства, занимают позицию «пущать не велено», и как раз именно они своими действиями могут нивелировать огромное количество разумных и полезных начинаний Верховного Суда по обеспечению гласности судебных процессов.

Реальная ситуация с возможностью фиксировать ход судебных процессов, увы, остается в таком же печальном состоянии, как и до принятия Постановления «Об обеспечении гласности…». Хотя сам факт внимания Верховного Суда к назревшей проблеме дает основания надеяться на изменения.

Пленум высшей судебной инстанции абсолютно прав, когда напоминает судьям о гласности судебного процесса. Нормы закона, регулирующие возможность записи аудио- и видеоматериалов в зале судебных заседаний, предусмотрены в белорусском законодательстве. Они обязательны для исполнения всеми, и в первую очередь судьями наших национальных судов. Если норма права не работает, — значит, есть проблема в правоприменительной практике. И здесь необходимо сказать огромное спасибо Пленуму Верховного Суда Беларуси за то, что он пытается приводить эту практику в соответствие с Законом и здравым смыслом.

Конституция закрепила право на получение информации и право на открытый суд. Гражданский и уголовный процессуальные кодексы однозначно прописали процедуру и механизмы, по которым журналисты (впрочем, как и любой присутствующий в зале суда) со своего места могут производить фиксацию хода судебного процесса «предусмотренными законом средствами и способами» даже без уведомления и получения разрешения от судьи на звукозапись.

Международные стандарты, которые также являются частью нашей национальной правовой системы, однозначно определяют, что ограничение права на открытое слушание дела без достаточных оснований, а только лишь по воле председательствующего в

процессе, — это нарушение права на справедливый суд, что может повлечь пересмотр всего дела.

Из этого следует, что право фиксировать путем аудиозаписи все происходящее в зале белорусского суда во время процесса у журналиста есть и без разрешения человека, облаченного в черную мантию. Если же журналист хочет фотографировать или снимать на видео ход процесса, то и такое его право закреплено законом и регулируется гражданским и уголовным процессуальными кодексами. Однако в этом случае для реализации этого права требуется согласие сторон по делу и судьи.

Таким образом, если право законом предусмотрено, прописаны механизмы его исполнения, то надо быть настойчивыми в его реализации и соблюдении.

Для этого надо добиваться прежде всего пропуска в здание суда. Если человек в форме препятствует вашему проходу в здание, то тем самым он нарушает закон и ваши права. Следовательно, надо об этом немедленно информировать лиц, которые могут его наказать за это нарушение. Как правило, в нашей стране охрану входов в суды осуществляют сотрудники Департамента охраны МВД. Поэтому целесообразнее всего немедленно связаться с начальником территориального отдела охраны и требовать привлечения такого «сотрудника» к ответственности. Благо в эпоху высоких технологий узнать телефон территориального отдела департамента охраны в интернете совсем не сложно, особенно журналистам, которые умеют находить информацию. Также необходимо зафиксировать противоправное поведение охранника в «книгу жалоб и предложений», которая в обязательном порядке имеется в каждом суде. Если же охранник совсем перешел границы разумного и препятствует пройти в здание суда с применением насилия, то можно позвонить с сообщением о его противоправном поведении и в дежурную службу местной милиции по телефону 102.

Если же, попав в здание суда, вы лишены возможности войти в помещение, где будет рассматриваться дело, то и об этом необходимо сделать отметку в «книге жалоб и предложений», которая имеется во всех судах. Особенно если вам говорят, что причиной, по которой вам нельзя присутствовать при рассмотрении дела, является отсутствие свободных мест в помещении, а рядом находится пустой свободный и вместительный зал судебных заседаний. Также можно немедленно пойти на прием к председателю суда и сообщить ему, что нарушается закон — прямо в здании суда. Если вежливо попросить председателя суда принять меры по прекращению этого нарушения, то, как правило, председателю для разрешения конфликта достаточно просто по телефону дать «ценные указания» о неукоснительном выполнении требований процессуальных кодексов судье, которому по силам обеспечить дополнительными стульями помещение, где будет слушаться дело.

Но вот вы в зале судебных заседаний. Кстати, в качестве «залов» могут выступать как специально оборудованные для этого помещения, так и кабинеты судей или же даже актовые залы. «Писать звук» в судебных заседаниях, как говорилось выше по тексту, вы можете свободно, ни у кого не спрашивая разрешения. Поэтому смело включайте устройство аудиозаписи. Если же участники процесса или судья потребуют прекратить аудиозапись, то в спор лучше не вступать. Эффективнее свою позицию излагать в форме устного запроса к судье. Можно это делать в форме ходатайства. Например: «Прошу разъяснить мне, на какой норме закона основывается требование прекратить запись?» Поскольку таких норм нет, то, скорее всего, вести аудиозапись вам никто после вашего запроса запрещать не будет.


Все попытки препятствовать вам в реализации ваших прав необходимо фиксировать и обжаловать в установленном законом порядке. Тем более что Пленум Верховного Суда в своем Постановлении дал нам для жалоб отличную аргументацию. Пожалуй, именно сейчас появилась реальная возможность изменить порочную практику по применению незаконных ограничений гласности, которые фактически «закрывают» нашу судебную систему от внимания общественного мнения.



Именно с принятием данного Постановления есть все основания надеяться, что ситуация изменится и журналисты смогут беспрепятственно исполнять профессиональные обязанности по освещению судебных процессов и распространению информации о деятельности белорусских судов.

Ведь в конечном итоге по данному вопросу и у журналистов, и у судебной системы общие интересы и цели: обеспечить гласность при осуществлении правосудия, а именно сделать так, чтобы максимальное количество людей узнало о том, насколько справедливы, беспристрастны и независимы наши суды.

Даўно пераканаўся, што з узростам у чалавека сапраўдных сяброў не становіцца болей, хутчэй, наадварот. Аднак здараецца, што лёс сутыкае людзей, і на доўгія гады яны робяцца аднадумцамі.



Сяржук СЫС

Жыву, бунтую, хто зразумее?

Перабіраю стосы лістоў, напісаныя амаль нечытэльнай лацінкаю, якія дасылаў мне ў войска сябра Алесь Бяляцкі. Потым, калі Алеся таксама абулі ў кірзачы, ён пісаў у сваю чаргу мне з далёкай Свярдлоўскай вобласці, дзе давялося яму стаць механікам-кіроўцам браніраванага цягача.

Алесь Бяляцкі літаральна ўварваўся ў маё жыццё ў 1979 годзе, каб ад таго часу быць прысутным не толькі ў самых розных побытавых калізіях, але і ў грамадзянскіх учынках і падзеях.

Паэт Анатоль Сыс у адным са сваіх лістоў да мяне — дарэчы, ён таксама тут, у гэтым стосіку, — напісаў так: «Трымайся Алеся, з ім не прападзеш, але гора цяпнеш». Так яно і сталася… Алесь правёў за кратамі амаль тры гады. Надта не любяць у нашай краіне праваабаронцаў.

Памятаю ягоны апошні тэлефонны званок мне на лецішча, у нядзелю 31 ліпеня 2011 года, за некалькі дзён да ягонага арышту. Пасля кароткага прывітання Алесь пачаў чытаць верш, затым другі… Пачутае падалося мне нейкім знаёмым, блізкім, аднак аўтара пазнаць я не мог, таму запытаўся ў Алеся: «Чые?»

— Твае, — лаканічна адказаў ён. — Перабіраю вось архіў і натрапіў на твае армейскія лісты, а там — вершы.

Не збярог я ў свой час тую «вайсковую» паэзію для сябе, таму нецярпліва папрасіў Алеся, каб зрабіў мне копію. Аднак не ўдалося яму — праз пару дзён «павязалі».

Вось згадваю зараз нашае студэнцтва, і прыходзіць разуменне, што сённяшні Бяляцкі вырастаў яшчэ тады, падчас нашага навучання ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце.

З Алесем мы ў 1979 годзе патрапілі ў адну групу на гісторыка-філалагічным факультэце ГДУ, але сышліся не адразу. На тое была банальная прычына: першы семестр Бяляцкі жыў на кватэры, а я адразу акунуўся з галавой у інтэрнатаўскае жыццё. Некаторы час прыглядаліся адзін да аднаго, затым пакрысе пачалі дзяліцца думкамі, першымі сваімі паэтычнымі спробамі. Размовы пра літаратуру выліліся крыху пазней у стварэнне на факультэце рукапіснага альманаха.

Пазнаёміўшыся бліжэй, пачалі шмат падарожнічаць: спрабавалі пешшу прайсціся па беларускім Палессі, зладзілі паездку да магілы Максіма Багдановіча ў Ялту. Ужо тады мы скептычна ставіліся да многіх грамадска-палітычных рэалій і ў размовах і спрэчках шукалі іншай праўды, праз спасціжэнне культуры і гісторыі адчынялі для сябе невядомую нам Беларусь.

Зжаўцелая ад часу перапіска з Алесем, лісты датаваныя 1981–82 гадамі…

Некаторыя вытрымкі з лістоў даюць дакладнае ўяўленне аб тым, чым займаўся студэнт Алесь Бяляцкі, якія праблемы хвалявалі яго на той час, і ўрэшце адказваюць на галоўнае пытанне: у чым вытокі яго высокай грамадзянскай свядомасці і

прынцыповасці, менавіта тых якасцяў, пра якія сказаў паэт Ніл Гілевіч:

Мы ўзышлі не з насення,
што ветрам занесена,
Мы не дзікай травы
самарослыя парасткі.
У глыбінях зямлі,
гераічнай і песеннай,
Нашых душ карані —
з вузялкамі ўпартасці.



Падчас сходу літаратурнага аб'яднання «Тутэйшыя», 1987 год

«…У самым канцы падарожжа я заехаў у Менск пашукаць аднадумцаў і паглядзець, што там робіцца. І мне зноў пашэнціла! Чуеш, ты, лысы, я не адзін! Ты нават уявіць не можаш, як сур'ёзна там глядзяць на гэтую справу. Я сышоўся з хлопцамі з універу БДУ. Вельмі многа цяпер залежыць ад нас. Як прыеду — адразу пачынаю бурную дзейнасць. Гэта справа не на месяц, не на два. Гэта не хобі. Гэта справа ўсяго жыцця! Пачынаецца адраджэнне! Дзеля гэтага я гатовы на ўсё. Пачынаецца сапраўднае жыццё... І зноў цябе няма побач! Я не ведаю, як пойдуць справы зараз, але ж я вельмі спадзяюся на тваё вяртанне…»

«…Сяджу на жлобінскім вакзале і чакаю цягнік на Вільню… Пачынаецца чарговае падарожжа. Маршрут на 10 дзён такі: Вільня і тое, што каля Вільні (што ўваходзіла ў спрадвечнае беллітоўскае княства і, значыць, непасрэдна звязана з нашай гісторыяй). Потым еду — Коўна. Шауляй. Рыга. На адваротнай дарозе заеду ў Менск…»

Алесь не толькі шмат падарожнічаў… У тыя гады яго цікавілі самыя разнастайныя пытанні духоўна-культурніцкага адраджэння Беларусі, этнаграфія, гісторыя, археалогія, літаратуразнаўства, музыка. Ён — актыўны ўдзельнік літаратурнага гуртка «Крынічка» ГДУ.

«Зараз думаю зноўку аб часопісе, ну, вядома, ужо не такім, які мы выпускалі раней. От ад цябе і патрабуюцца вершы. Табе ж збоку лепей відаць, што ты там можаш зрабіць. Так што чакаю тваіх парад… Твой верш надрукуем у «Леры» («Лера» — дачка нашага «Руна»). Узровень значна вышэйшы. Вялікае месца займае публіцыстыка. І яшчэ парада — працуй над сваёй мовай, працуй над сэнсам радка!..»

«Прывітанне, Сяргей! Пішу ад муроў старажытнага Мірскага замка, дзе я зараз працую рабочым на раскопках і выкідваю па некалькі тон гаршчкоў, кафлі, фаянсу, кандэлябраў у дзень. Замак цудоўны, я быў у казцы. Карацей кажучы, пашэнціла, не кожны ж умее капаць такі замак, як Мірскі. Ды і сам Мір вельмі цікавы па гіст. забудове. Падабраўся цікавы кантынгент хлопцаў-менчукоў. Пасля працы — лекцыі, дыспуты, размовы багата аб чым».

«…У нас усё паціху варушыцца. Паступова знаходзяцца людзі. Кожную пятніцу праводзім "вячоркі", на якіх разбіраем пытанні аб мастацтве, культуры, літаратуры, гісторыі. Збіраецца чалавек па 30. Рабілі ў інтэрнаце вечар, прысвечаны Максіму Багдановічу. Кажуць, атрымалася няблага. Я, Толік, Эдзік, Скачынскі — новая рок-група на беларускім небе, праўда, сола добрага няма. Але ж рэпетуем».

«…За гэты час вельмі багата пазнаў і па гісторыі Беларусі, і наогул гісторыя цяпер для мяне — другое хобі (першае — наша рок-суполка "Баскі"). Нас, "Баскаў", высвабадзілі ад "бульбы", і мы другі тыдзень рэпетуем...

…Мы стварылі спеўна-драматычную майстроўню, далі нам і кіраўніка з музычнай адукацыяй, і грошай на касцюмы, музычныя прылады. Пачынаем рабіць з гэтага нейкую культурна-асветніцкую школку, каб людзі туды не толькі спяваць прыходзілі, але і нешта з нашай культуры і гісторыі атрымоўвалі».

Неяк неўпрыкмет, у часе вучобы на гісторыка-філалагічным факультэце ГДУ, Алесь Бяляцкі неўзабаве стаў цэнтрам гомельскага грамадска-культурнага жыцця, аўтарытэтным натхняльнікам многіх пачынанняў і ініцыятыў, што пазней у Менску, падчас навучання ў аспірантуры Акадэміі навук, выявілася ў значна шырэйшым аб'ёме. Пры гэтым у яго знаходзіўся час і на вучобу, і на самаадукацыю.

«Узяўся за вывучэнне польскай мовы пасапраўднаму. Праўда, чытаю пакамест толькі адную фантастыку і дэтэктывы. Сесію здаў нармальна і ўсе экзамены, акрамя рускай літаратуры, здаваў на беларускай мове. Выходзіць нармальна… Калі ты прыедзеш (з войска), табе будзе значна лягчэй, чым нам, бо адразу пападзеш у беларускамоўнае асяроддзе. Пішы там хоць як, не забывай на прозу — замалёўвай усё — прыдасца потым, не спадзявайся на памяць».

Больш за трыццаць гадоў сышло, як пісаліся гэтыя лісты, шмат што змянілася за пакручасты і непрадказальны адмерак часу нашага знаёмства, аднак нязменным засталося толькі адно — вера ў свайго сябра і аднадумца Алеся Бяляцкага.

Феномен Желнова

Бобруйский блогер Желнов — как птица Феникс: его и бьют, и судят, и штрафуют, а он опять «возрождается», в очередном своем посте. Если бы блогера Желнова не было, его следовало бы выдумать. Поскольку — и время, и место. Время и место для «гражданской журналистики», как ее теперь называют.

Такие возможности, такие формы существования журналистике дал интернет. От которого теперь не спрятаться, не скрыться — ни диктаторам-самодурам, ни просто, скажем, «самодурствующим» милиционерам.

Между тем наш герой, похоже, стал уже «страшным сном» для бобруйского УВД. Поскольку — действует строго в рамках закона и от милиционеров требует того же.

